УДК 070(043.3)+808.26(043.3)

**Маліцкі Юрый Вячаслававіч**
кандыдат філалагічных навук,
дактарант Інстытута мовазнаўства
імя Якуба Коласа
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі
навук Беларусі
г. Мінск, Беларусь

**Yury Malitski**
PhD in Philology, Post-PhD Researcher
of the Institute of Linguistics named after
Yakub Kolas
Center for Research of Belarusian Culture,
Language and Literature
National Academy of Sciences of Belarus
Minsk, Belarus
sp-sm@mail.ru

# БЕЛАРУСКІЯ АНАНІМНЫЯ ГУТАРКІ XIX ст. У ТЭКСТАВАЙ ПРАСТОРЫ ДЫСКУРСУ МАСАВАЙ КАМУНІКАЦЫІ

# BELARUSIAN ANONYMOUS CONVERSATIONS OF THE 19th CENTURY IN THE TEXT SPACE OF MASS COMMUNICATION DISCOURSE

У артыкуле аналізуюцца беларускія ананімныя гутаркі XIX ст. у аспекце рэалізацыі ў іх асноўных характарыстык публіцыстычнага тэксту. Разглядаюцца спосабы і моўныя сродкі фарміравання ў тэкставай прасторы твораў актуальнага для таго часу дыскурсу масавай камунікацыі.

К л ю ч а в ы я  с л о в ы: *беларускія ананімныя гутаркі*; *дыскурс*; *сродкі масавай камунікацыі*; *публіцыстычны тэкст*; *медыялінгвістыка*.

The article analyzes Belarusian anonymous conversations of the 19th century in terms of the implementation of the main characteristics of a journalistic text in them. The methods and linguistic means of forming the relevant for that time mass communication discourse in the text space of the works are considered.

K e y  w o r d s: *Belarusian anonymous conversations*; *discourse*; *mass media*; *journalistic text*; *media linguistics*.

У другой палове мінулага стагоддзя ў рэчышчы распрацоўкі тэарэтыка-метадалагчных пытанняў лінгвістыкі тэксту былі сфармуляваны прынцыпы дыскурснага падыходу да вывучэння складаных моўных знакаў і мовы ўвогуле. Падыход узнік у выніку спробы амерыканскага лінгвіста З. Харыса прымяніць методыку дыстрыбутыўнага аналізу сінтаксічных адзінак да тэкстаў з улікам акалічнасцей сацыякультурнай сітуацыі іх стварэння і функцыянавання. Аўтар называў уласны падыход аналізам звязнага маўлення і бачыў яго прызначэнне ў пашырэнні дэскрыптыўнай лінгвістыкі за межы сказу "ў дадзены момант часу і для суаднясення культуры і мовы" (цыт. па: [1, с. 59]).

Неаднастайнасць поглядаў на анталогію тэксту і яго асноўныя функцыянальныя характарыстыкі абумовіла разыходжанні ў разуменні дыскурсу як навуковага паняцця. Прыярытэт камунікатыўнай скіраванасці тэкставых адзінак вызначыў уяўленне аб дыскурсе як аб сацыяльна значным маўленчым дзеянні, змест якога вызначаецца "намерамі адрасанта маўлення ў працэсе

зносін, узаемасувяззю аўтарскай інтэнцыі з іншымі экстралінгвістычнымі фактарамі ў форме адпаведнасці паміж ілакутыўнай мэтай і абставінамі маўленчага акта, псіхалагічным станам адрасанта маўлення, яго сацыяльным статусам, уяўленнямі аб сітуацыі маўлення і аб слухачы" [2, с. 12]. Прызнанне першаснасці кагнітыўнай (гнасеалагічнай) функцыі тэкстаў абумовіла разуменне дыскурсу як "абмежаванага пэўнымі храналагічнымі рамкамі працэсу выкарыстання мовы, абумоўленага тыпам сацыяльнай актыўнасці людзей" [2, с. 12]. Так ці інакш, сучаснае навуковае бачанне дыскурсу базуецца на ўсведамленні цеснага перапляцення лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў, што з'яўляюцца асноўнымі фарміравальнымі кампанентамі з'явы: "дыскурс разумеецца ў якасці праяўлення мовы як сацыяльна-псіхалагічнай сістэмы ў выглядзе эмпірычнага знака-тэксту (г. зн. рэалізацыі тэксту ў маўленні) і ў той жа час аб'екта даследаванняў, накіраваных на стварэнне тэорыі выкарыстання мовы" [3, с. 35].

Тэкст – базавы элемент дыскурсу. Такі статус засноўваецца на дэнататыўнай сувязі фармалізаванай семантыкі тэкстаў з канкрэтнымі сітуацыямі рэчаіснасці, акалічнасцямі і ўдзельнікамі працэсу камунікацыі. Ключавымі фактарамі, што вызначаюць змястава-прагматычнае напаўненне дыскурсу, з'яўляюцца ўзаемаадносіны суб'екта і аб'екта камунікацыі, іх экстралінгвістычныя мэтавыя ўстаноўкі, абумоўленыя сацыяльнымі ролевымі функцыямі. Адзін з заснавальнікаў лінгвістыкі тэксту і дыскурснага аналізу Т. А. ван Дэйк асноўную ролю ў фарміраванні і разуменні дыскурсу як сукупнасці разнажанравых тэкставых адзінак надаваў так званым ментальным мадэлям. Яны, на думку мовазнаўца, "рэпрэзентуюць падзею так, як мы яе перажываем (ці так, як даведваемся аб ёй), складаюць базіс усіх жанраў дыскурсу, заснаваных на рэпрэзентацыі такіх падзей, як размовы, гісторыі або навіны" [4, с. 7]. Сапраўды, мадэляванне вызначальных у змястава-структурным плане тэкстаўтваральных сувязей немагчымае без апоры на суб'ектыўныя і прагматычны аспекты маўлення – індывідуальныя і групавыя кагнітыўна-псіхалагічныя асаблівасці адрасата паведамлення, яго інфармацыйны запыт у канкрэтны прамежак часу, тып адносін аўтара тэксту і яго чытача/слухача ў працэсе моўнага кантакту ў канкрэтных аб'ектыўных абставінах. Інфармацыйную плынь па прычыне вялізнай колькасці праяў рэчаіснасці і магчымых спосабаў іх інтэрпрэтацыі складана ўпарадкаваць і сістэматызаваць. Менавіта ў гэтым найбольш значнай бачыцца роля публіцыстыкі і аналітычнай журналістыкі. А фарміраванне дыскурсу, у такім аспекце, – функцыянальным інструментам ажыццяўлення аналітычна-фарміравальнай грамадскай практыкі.

Даследчыкі па праву называюць XIX ст. пачаткам новай беларускай літаратуры. Ход нацыянальнага літаратурнага працэсу першай паловы стагоддзя быў вызначаны агульным ростам цікавасці да гісторыі (даследаванні І. Даніловіча, Т. Нарбута, братоў Тышкевічаў і інш.), мовы (параўнальна-гістарычныя і дыялекталагічныя работы К. Калайдовіча, А. Кіркора, Ю. Крашэўскага, С. Ліндэ, І. Насовіча і інш.), матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа (пошукавая і апісальная фальклорна-этнаграфічная дзей-

насць З. Даленгі-Хадакоўскага, Р. Зянькевіча, А. Рыпінскага, І. Храпавіцкага, Я. Чачота, П. Шпілеўскага і інш.); уплывам рускіх пісьменнікаў і паэтаў (М. Гогаля, А. Грыбаедава, І. Крылова, А. Пушкіна); творчасцю дзеячаў польскай культуры, ураджэнцаў беларускіх зямель – кампазітараў (М. Агінскага, С. Манюшкі), мастакоў (В. Ваньковіча, Я. Дамеля, А. Шэмеша і інш.), паэтаў (А. Адынца, Ю. Крашэўскага, Т. Лады-Заблоцкага, А. Міцкевіча, А. Плуга і інш.). Вялікую ролю ў працэсе фарміравання беларускай філасофска-эстэтычнай і літаратурнай думкі ў першай трэці XIX ст. адыгрывала дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, беларускі тэатр. На гэты самы час прыпадае і актыўнае пашырэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы беларускага друку, развіццё кніжнага гандлю, зараджэнне афіцыйнай і прыватнай прэсы на рускай і польскай мовах.

Ход гістарычных падзей XVI–XVIII стст. абумовіў складванне на этнічных беларускіх землях дзяржаўна-палітычнай сітуацыі, у якой беларускае слова было выцеснена з афіцыйнага грамадскага ўжытку. У такіх умовах у першай палове XIX ст. пачалі з'яўляцца і хутка набылі папулярнасць у выніку пашырэння ў рукапісным і вусным выглядзе беларускамоўныя мастацка-публіцыстычныя творы сацыяльна-палітычнай накіраванасці. Гэта былі белетрызаваныя, пераважна вершаваныя, апавяданні, у якіх у форме дыялогу абмяркоўваліся надзённыя пытанні грамадскага жыцця. У айчынным літаратуразнаўстве за такімі творамі замацаваўся тэрмін ***гутарка***. Асноўнымі іх персанажамі былі сяляне або іншыя прадстаўнікі беларускага вясковага насельніцтва. Аўтарства гутарак, як правіла, не пазначалася, што было звязана з функцыянаваннем тэкстаў ва ўмовах цэнзуры. Балансуючы на мяжы літаратурнага твора і публіцыстычнага артыкула, гутаркі спалучалі народную сюжэтную і моўна-вобразную базу з вострасацыяльным зместам. Яны прама або іншасказальна закраналі надзённыя палітычныя праблемы, давалі трапную характарыстыку прадстаўнікам розных грамадскіх слаёў, распавядалі аб цяжкім жыцці сялян пад прыгонам, актуалізавалі ўяўленні беларускага сялянства і дробнай шляхты аб пажаданым спосабе дзяржаўнага і эканамічнага ўладкавання. Гутаркі надалі беларускаму слову, па аб'ектыўных абставінах выцесненаму на перыферыю грамадскай камунікацыі, сацыяльнае гучанне і сфарміравалі камунікатыўную прастору, у межах якой быў усталяваны кантакт паміж сялянствам, нацыянальна арыентаванай шляхтай, творчай інтэлігенцыяй, іншымі слаямі беларускага грамадства.

Кагнітыўная лінгвістыка, у межах якой нарадзіўся і атрымаў развіццё метад дыскурснага аналізу, разглядае тэкст як складаную камунікатыўную з'яву, што акумулюе іерархію ведаў пра этнакультурныя коды эпохі, ілакутыўныя мэты, ментальную і сацыяльную памяць грамадства канкрэтнага перыяду. Адпаведна, моўна-маўленчыя сродкі, задзейнічаныя ў аб'ектыўных сітуацыях зносін, формы іх сістэмнай арганізацыі з'яўляюцца ёмістай формай перадачы звестак аб экстралінгвістычнай сітуацыі і, адпаведна, аб дыскурсе канкрэтнага гістарычнага перыяду.

“Гутарка Данілы са Сцяпанам” – адзін з найбольш вядомых і значных у мастацкім плане твораў жанру. Ён з’явіўся ў канцы 1850-х гг., напярэдадні адмены прыгоннага права, калі ў грамадстве шырока абмяркоўваліся варыянты маючай неўзабаве адбыцца сялянскай рэформы 1861 г.

Семантыка слова *гутарка* (*размова*) прадугледжвае двухбаковы характар арганізацыі маўлення – ‘слоўны абмен звесткамі, думкамі’ [5, с. 682] – і адносны парытэт у размеркаванні роляў у працэсе зносін. У апошнім “Гутарка Данілы са Сцяпанам” выяўляе істотную дыспрапорцыю: аднаму з персанажаў належыць вядучая роля ў дыялогу. Зместавым і кампазіцыйным ядром “Гутаркі” з’яўляецца маналог Данілы. Сцяпан прысутнічае ў размове як слухач, да якога той час ад часу звяртаецца. Такая камунікатыўная арганізацыя яскрава сведчыць аб тым, што “Гутарка”, і іншыя падобныя творы, адназначна разглядалася стваральнікамі як функцыянальная адзінка грамадскага ўзаемадзеяння – як форма звароту да шырокай аўдыторыі ў час лёсавызначальных сацыяльных пераўтварэнняў. Замацаваныя за галоўнымі героямі актыўная і пасіўная камунікатыўныя пазіцыі – эфектыўны спосаб актуалізацыі адносін суб’екта і аб’екта маўленнння. У тэкстаўтваральным плане вобраз Данілы служыць сродкам непасрэднага выражэння аўтарскіх думак і імкненняў, а вобраз Сцяпана, у сваю чаргу, выступае камунікатыўнай падставай для фармалізацыі звароту да субяседніка і, праз яго, да ўсяго беларускага сялянства: *Будзе тое, браце, дажджом, мой Сцяпане, / Што пан на нас скажэць: “Мой каханы пане!” / Мы на іх глянем і шапкі не знімем. / Хоць блізка нас будзець, не скланіўшысь мінем* [6, с. 1047].

Публіцыстычнае гучанне беларускіх сялянскіх гутарак абумовіла актуальная сацыяльна-палітычная, маральна-этычная праблематыка, а таксама высокая ступень рэалістычнасці і факталагічнасці. Задача стваральніка “Гутаркі Данілы са Сцяпанам”, відавочна, звязаная з пашырэннем антыпрыгонніцкіх настрояў у грамадстве, вызначыла характар прагматыкі тэксту – устаноўку на адназначнае ўспрыняцце зместу і разлік на канкрэтны перлакутыўны эфект. Кіруемы маналог як кампазіцыйны стрыжань твора стаў найбольш прыдатнай формай рэалізацыі такой інтэнцыі. Названы спосаб тэкстуалізацыі аўтарскай пазіцыі дазволіў эфектыўна ўвасобіць думкі і меркаванні, сфармуляваць высновы, актуалізаваць пэўныя наратывы.

“Гутарка Данілы са Сцяпанам” – яскравы прыклад рэалізацыі ў літаратурным творы асноўных характарыстык публіцыстычнага тэксту. У першую чаргу, **падзейнасці**. Падзея як аб’ектыўная праява матэрыяльнага свету – адзін з базавых элементаў змястава-тэматычнага падмурку адзінак грамадскай камунікацыі. Падзейнасць цесна звязана з адной з цэнтральных катэгорый тэксту – інфарматыўнасцю [7]. У тэкстаўтваральным плане падзейнасць забяспечваецца апісаннем, інтэрпрэтацыяй дзеянняў або станаў суб’екта і/ці аб’екта ў прывязцы да канкрэтных рэалій [8]. Спосабамі такой прывязкі ў літаратуразнаўстве лічацца “адлюстраванне рэчаіснасці ў формах, узятых з жыцця, якое разглядаецца ў развіцці, паказ чалавечага характару

ў сувязі з сацыяльнымі абставінамі, псіхалагічны аналіз і матывацыя ўчынкаў герояў, адлюстраванне не выключных, а тыповых характараў, акцэнтаванне ўвагі на паўсядзённым побыце сучаснікаў, ацэнка падзей з пазіцый агульнапрынятай маралі прадстаўнікоў усіх сацыяльных пластоў грамадства (ад жабрака да арыстакрата), павышэнне ролі вобраза апавядальніка" [9, с. 13]. У кантэкст сацыяльных і побытавых умоў сялянскага жыцця чытач пагружаецца ўжо з першых радкоў маналогу Данілы. Тэкстуалізацыя праяў рэчаіснасці ў "Гутарцы" ажыццяўляецца за кошт літаратурнага прыёму нанізвання фактаў – рытмічнага пералічэння тыповых працоўна-гаспадарчых сітуацый. Моўная аб'ектывацыя прыёму найчасцей адбываецца пры дапамозе сінтаксічных канструкцый з аднародным падпарадкаваннем: *На прыгон без счоту: з сярпом із касою, / З валамі да арання, коні з бараною – / Тэй паліць вугалле, тэй рыбу лавіць, / Таму на сенажаці кусты церабіць, / Тэй павязець водку, а тэй муку, збожжа, / Загадаюць работ, сцеражы ты, Божа* [6, с. 1049] або *Ты ідзі малаціць, ты ў млын малоці, / Ты картофлю рэзаць, а ты ідзі садзіці; / Таму быдла пасвіць, а таму авечкі, / Ты да коп на варту, а ты йдзі да грэчкі. / Ты ступай да коні, а ты за свіннямі, / Малага да качак, большага за гусямі* [6, с. 1050].

Паслядоўнае выкарыстанне дзеясловаў трэцяй асобы пры фармалізацыі аб'ектна-дзейнасных адносін – выразны маркер аўтарскай прагматыкі ў сялянскіх гутарках XIX ст. Такім спосабам у тэкстах канстатуецца стан рэчаў, фіксуюцца дзеянні актараў у межах сітуацыі. Увасобленая названымі дзеяслоўнымі формамі пазіцыя назіральніка ў сукупнасці з рэлевантнасцю паведамлення забяспечвае такія характарыстыкі тэксту, як **аб'ектыўнасць** і **актуальнасць**. Нямецкі даследчык Г. Рагер найважнейшым паказчыкам актуальнасці публіцыстычнага тэксту лічыць адлюстраванне ў ім аб'ектыўнай сітуацыі з удзелам канкрэтных гістарычных асоб у канкрэтных прасторава-часавых абставінах [10]. Рэальныя гістарычныя і абагуленыя сацыяльныя тыпы (асноўныя суб'ектныя канцэпты маналогу Данілы) і іх дзеянні прадстаўлены ўжо ў першых радках: *Гаворaць на свеце, ў голас талкуюць – / … усе людзі чуюць, / Што вольнасць **нам** бедным <u>дасць</u> **Цар** без адкладу, / Што толькі з **панамі** <u>не найдзе</u> ён ладу* (выдзелена намі. – *Ю. М.*) [6. с. 1047]. У чатырохрадкоўі названы ўсе галоўныя дзеючыя асобы маналогу і аб'ектыўнай грамадскай сітуацыі, апісанню якой ён прысвечаны: *мы* (сяляне), *цар*, *паны*. Аб'ектным канцэптам, прадстаўленым у апісальна-метафарычнай форме, з'яўляецца сялянская рэформа (*вольнасць … дасць Цар*). Пачатковая страфа ў анатаваным выглядзе раскрывае асноўны змест усяго маналогу. Па сутнасці, яна выконвае ролю медыйнага ліду (ад англ. *lead paragraph*) – уводнага параграфа артыкула або навіны, які "сцісла перадае змест усяго журналісцкага тэксту або яго пэўнай структурнай часткі, выконваючы пры гэтым функцыю інфармавання і эмацыйнага ўздзеяння" [11]. Менавіта сугестыўна-прагматычным прызначэннем гэтых радкоў, на нашу думку, тлумачыцца метафарычны характар рэпрэзентацыі канцэпту "сялянская рэформа".

Інтэрпрэтацыя сутнасці сістэмы заканадаўчых актаў 1861 г., рэалізаваная словазлучэннем *даць вольнасць*, відавочна, валодае значна большым экспрэсіўным патэнцыялам у параўнанні з нейтральнымі намінацыямі кшталту *рэформа, маніфест* і да т.п.

У журналісцкай практыцы выпрацавана эфектыўная і пашыраная сёння формула напісання так званага *рэдакцыйнага артыкула* – SPECS. Тэрмінам *рэдакцыйны артыкул* (англ. *editorial*) абазначаюць жанр аналітычнай журналістыкі. Такія артыкулы адлюстроўваюць погляд на пэўную падзею або грамадскую з'яву ў адпаведнасці з палітычнай і ідэалагічнай накіраванасцю выдання. Абрэвіятура SPECS раскрывае алгарытм напісання аналітычнага артыкула і прадугледжвае паслядоўнасць пэўных зместавых фрагментаў: *State/Сцвярджэнне – Position/Аўтарская пазіцыя – Evidence/Доказы* і *аргументацыя – Conclusion/Выснова – Solution/Прапанова* па вырашэнні сітуацыі. Рэалізацыя гэтага алгарытму ў медыйным тэксце забяспечвае такую зместавую характарыстыку, як **аналітычнасць** [12]. Менавіта ў адзначанай паслядоўнасці пададзены структурныя часткі маналогу Данілы. Спачатку "агучваецца" тэзіс аб тым, што неўзабаве плануецца правядзенне сялянскай рэформы (State/Сцвярджэнне). Далей выкладаецца персанальнае бачанне сітуацыі, даецца суб'ектыўная характарыстыка яе ўдзельнікаў і матываў іх паводзін (Position/Аўтарская пазіцыя). Так, Даніла (аўтар) лічыць, што напярэдадні сялянскай рэформы паны не хочуць, каб сялянам далі волю, таму падманваюць цара, малюючы простых людзей у негатыўным святле: *Згаварыўшысь з сабою, Цару так талкуюць: / "Пане найяснейшы, што з гэтага будзець, / Даўшы ўсім вольнасць, кажан тоя згудзіць; / Бо мужык без пана быць ніяк не можа – / Паб'юцца, паколюцца, сцеражы ты, Божа, / Над імі трэба штодзень – з кнутом стаяць над каркам, / Розгі каб ляжалі з возам – за хвальваркам"* [6, с. 1047]; *Вот, братка, як яны падлыгаць умеюць, / Перад Царом у вочы на нас плесці смеюць!*; *Верыць ім Цар смела, Яны й ласку маюць. / А мы, бедныя, церпім скрозь няволю, / Праклінаем жыццё сваё і горкую долю* [6, с. 1047–1048] і г.д. Канстатацыя цяжкага стану беларускага сялянства ажыццяўляецца за кошт рэалістычнага апісання жыцця ва ўмовах прыгону (Evidence/Доказы): *Магазын адсып, аддай да зярняці, / А сам – без кусочка хлеба – аставайся ў хаце* [6, с. 1049]; *У валоўні, як чорт у пекле, таўчыся, / Няма там спагаду – ці плач, ці маліся; / Ці дождж, ці завея, ці мароз найгоршы, / Чым горша надвор'е, то тым прыказ большы* [6, с. 1049] і г.д. Паводле аўтарскага меркавання, укладзенага ў вусны Данілы, вырашэнне гэтай сітуацыі магчымае толькі праз поўнае скасаванне прыгоннага права і справядлівае надзяленне сялян зямлёй (Conclusion/Выснова і Solution/Прапанова па вырашэнні сітуацыі): *Прыгон як урвецца, талакі не стане. / Скончыцца адразу іхне панаванне! / Тагды паны, хіба што, бяду пазнаюць, / Бо цяпер ніколі нам не спагадаюць* [6, с. 1050].

Літаратурныя паводле спосабу выкладу гутаркі, тым не менш, выразна дэманструюць рысы мэтавай грамадскай функцыянальнасці – іншымі

словамі, **агітацыйна-прапагандысцкага** прызначэння, таксама ўласцівага тэкстам сродкаў масавай камунікацыі. Вершаваная форма, максімальна прыдатная для даслоўнага запамінання і ўзнаўлення, як можна меркаваць, мела важнае значэнне ў плане распаўсюджання і данясення ідэйнага зместу твораў да самых шырокіх слаёў грамадства – у першую чаргу, сялянства, прадстаўнікі якога былі пераважна непісьменнымі і не маглі самастойна прачытаць друкаваны або рукапісны тэкст. Асобныя гутаркі валодалі фармальнымі прыкметамі перыядычных выданняў. Напрыклад, "Гутарка двух суседаў" выдавалася на працягу 1861–1862 гг. асобнымі нумараванымі выпускамі (чатырохстаронкавымі брашурамі). Усяго выйшла чатыры нумары, што стала падставай для даследчыкаў лічыць гутарку "першым беларускамоўным перыядычным выданнем" [13, с. 836–837].

Ва ўмовах ізаляванасці беларускага слова ананімныя сялянскія гутаркі XIX ст. адыгралі важную ролю не толькі ў рэалізацыі айчыннага літаратурнага працэсу, але і ў фарміраванні сферы беларускамоўнай грамадскай камунікацыі. Яны ў поўнай меры ўвасаблялі асноўныя характарыстыкі публіцыстычнага тэксту і ў адпаведным фармальна-зместавым выглядзе задавальнялі запыт грамадства на аналітычныя і дыскусійныя матэрыялы, прысвечаныя надзённым праблемам грамадска-палітычнага жыцця. Абапіраючыся выключна на сродкі народнай беларускай мовы, гутаркі заклалі пачатак распрацоўкі медыйных тэхналогій фарміравання кагнітыўных схем адлюстравання падзей рэчаіснасці з падкрэсліваннем рыс, аб'ектыўная важнасць і камунікатыўная значнасць якіх вызначалася асаблівасцямі актуальных гістарычных працэсаў. Асвятляючы галоўныя праблемы грамадскага жыцця, гутаркі ў сярэдзіне XIX ст. забяспечылі складванне беларускай грамадска-палітычнай інфармацыйнай павесткі. А дзейнасць, накіраваная на яе канструяванне і карэкціроўку, вызначала абрысы інфармацыйнай плыні, што ўвасобіла найважнейшыя элементы дыскурсу на зломе гістарычных эпох.

Аб'ядноўваючы рысы мастацкай літаратуры і вострай публіцыстыкі, вырашаючы актуальныя камунікатыўныя задачы, аўтары ананімных сялянскіх гутарак інтуітыўна шукалі найбольш эфектыўныя спосабы і сродкі данясення да адрасата актуальных зместаў і наратываў. Тэкставая прастора гутарак стала сферай, дзе выпрацоўваліся ўласнабеларускія, заснаваныя на мясцовых асаблівасцях і рэаліях, спосабы тэкстуалізацыі аўтарскай інтэнцыі. У рэчышчы гэтай дзейнасці адбываўся стыхійны працэс фарміравання інфармацыйна-лінгвістычных тэхналогій, якія ў найбольшай ступені адпавядалі стану тагачаснага беларускага грамадства. Пры гэтым трэба заўважыць, што вектар прафесійнага пошуку беларускіх аўтараў у аспекце выпрацоўкі эфектыўных спосабаў і сродкаў увасаблення неабходнага зместу цалкам стасаваўся з агульным напрамкам развіцця сусветнай публіцыстычнай думкі таго часу.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Макаров, М. Л.* Основы теории дискурса / М. Л. Макаров. – М. : ИТДГК «Гнозис», 2003. – 280 с. – URL : http://yanko.lib.ru/books/cultur/makarov-osnovu_teorii_diskursa-8l.pdf (дата звароту: 01.04.2025).
2. *Ермакова, Л. В.* Дискурсивный анализ: современные подходы : учеб.-метод. пособие / Л. В. Ермакова. – Благовещенск : Изд-во АмГУ, 2021. – 53 с.
3. *Іўчанкаў, В. І.* Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : БДУ, 2003. – 257 с.
4. *Дейк, Т. А. ван.* Дискурс и знание / Т. А. ван Дейк // Научные ведомости. Серия: Гуманитарные науки. – 2013. – № 13. – Вып. 18. – С. 5–23.
5. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / уклад. І. Л. Капылоў [і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.
6. Гутарка Данілы са Сцяпанам // Літаратура першай паловы XIX стагоддзя / укладанне і каментарыі М. В. Хаўстовіча ; навук. рэд. С. Л. Гаранін. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 1086 с.
7. *Гальперин, И. Р.* Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин. – М. : УРСС Эдиториал, 2008. – 144 с.
8. *Болотнова, Н. С.* Филологический анализ текста / Н. С. Болотнова. – Томск : Изд-во ТГПУ, 2006. – 630 с.
9. *Запрудскі, І. М.* Агляд літаратурнага жыцця і тэндэнцыі эстэтычнай эвалюцыі ў прыгожым пісьменстве Беларусі ў XIX ст. / І. М. Запрудскі // Беларуская літаратура і культура XIX стагоддзя: асаблівасці развіцця і актуальныя пытанні даследавання. – Мінск : БДУ, 2021. – С. 5–20.
10. *Rager, G.* Qualitat in der Zeitung. Ergebnisse erster Untersuchungen / G. Rager // Redaktion 1994. Almanach fur Jurnalisten / Red. M. Begemann, B. L. Floper. – Bonn, 1993. – P. 165–170.
11. *Ленкова, Т. А.* Лид – структурный элемент статьи и самодостаточный текст / Т. А. Ленкова // Филология и человек. – 2023. – № 1 – URL : https://cyberleninka.ru/article/n/lid-strukturnyy-element-stati-i-samodostatoch-nyy-tekst (дата звароту: 01.04.2025).
12. *Черкашина, А. А.* Композиционные особенности аналитических медиатекстов качественной англоязычной газетной периодики / А. А. Черкашина // Научные ведомости Белгородского государственного университета. Серия: Гуманитарные науки. – 2016. – № 14 (235). – Вып. 30. – С. 98–102.
13. Літаратура другой паловы XIX стагоддзя : у 2 ч. / укладанне Л. Г. Кісялёвай, Н. М. Сенкевіч; каментары Л. Г. Кісялёвай; навук. рэд. С. Л. Гаранін. – Мінск : Маст. літ., 2013. – Ч. 1. – 847 с.


*Поступила в редакцию 16.04.2025*